традиционным ценностям образованность, сохраняется в своей подлинности. В результате советская интеллигенция обеспечила целый ряд положительных особенностей и достижений советской культуры. В обстоятельствах ценностного вакуума постсоветской реальности и нарастания тенденций контрпросвещения интеллигенция как социальный слой размывается и постепенно исчезает.

УДК 94:332.54(476.6)

**ЭВАКУАЦЫЯ ПЕРСАНАЛА І МАЁМАСЦІ ДЭПАРТАМЕНТА ЗЕМЛЯРОБСТВА ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІІ Ў 1915 Г.**

**Галубовіч В.У., Радзюк А.Г.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На пачатку XX ст. ў беларускіх губернях пачала фарміравацца сістэма ўрадавай дапамогі і каардынацыі развіцця сельскай гаспадаркі. Мерапрыемствы ўрада не здолелі хутка і радыкальна змяніць жыццё сялян, аднак аб’ектыўна спрыялі развіццю аграрнай культуры. Пачатак Першай сусветнай вайны паволі спыніў запозненую мадэрнізацыю селькагаспадарчай вытворчасці на Гарадзеншчыне. Дэпартамент земляробства Галоўнай управы земляробства і землекарыстання Гарадзенскай губерніі з лета 1914 г. аказваў дапамогу ў абмежаваных памерах з-за скарачэння фінансавання і мабілізацыі супрацоўнікаў у армію. Не спынялі працу і сельскагаспадарчыя таварыствы. Іх дзейнасць падлягала кантролю Дэпартамента з улікам спецыфічных патрабаванняў вайсковага часу. Так, у лютым 1915 г. Слонімскае, Верцялішскае, Кузніцкае, Астрамечаўскае, Антоніна-Арэпічскае сельска-гаспадарчыя таварыствы і Гарадзенскае таварыства садаводаў былі змушаныя складаць даведкі ў Дэпартамент з інфармацыяй, што замежных падданых у складзе гэтых арганізацыяў няма.

Праца дэпартамента земляробства не спынялася да самага падыходу нямецкай арміі ў 1915 г., калі пачалася масавая эвакуацыя. Вось як апісваў становішча інструктар Дэпартамента С. Паўлаў у лісце да ўрадавага аграномa Гарадзенскай губерні А.С. Еленеўскага ад 10 жніўня 1915 г.: “*Выехаць ў Саколку не магу, паколькі яшчэ восьмага жніўня ўсе Сакольскія ўстановы эвакуіраваныя і цягнікі ў Саколку не ідуць. Конныя земскія станцыі не працуюць ... [у Гародні]. Усе ўстановы чатыры дні гатовыя да ад’езду ў Калугу, але з-за адсутнасці вагонаў сядзяць у Гародні без справы. На вакзале паніка. Усе рызыкуюць кінуць рэчы і ісці пехатой, у тым ліку і ўправа. Вам*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

*дасланыя прапановы на выезд у Калугу і вываз казённай маёмасці. Пры мне знаходзіцца майстар В.А. Берней. Паедзем разам у Калугу можа нават і сёння, калі будзе прапанова і месца ў вагоне. У Гародню па ніводнай справе не рэкамендую высылаць ... Майстрам па паляводстве А.П. Уласавым адпраўляюцца ў Слонім с.-г. пракатныя машыны і прылады з Азёр і Верцялішак Гарадзенскага павета. Сам жа ён, верагодна, на днях будзе прызваны ў войска , як ратнік 1-га разраду".*

***Эвакуацыя людзей***. З набліжэннем фронту да губерніі праблема вывазу супрацоўнікаў Дэпартамента станавілася ўсё больш актуальнай. Аднак яшчэ за некалькі тыдняў да эвакуацыі ўрадавы аграном А.С. Еленеўскі дакладна не ведаў пра лёс сваіх супрацоўнікаў. Як вынікае з яго запыту ад 1 жніўня 1915 г., Гарадзенская ўправа земляробства і дзяржаўных маёмасцяў павінна была выехаць у Смаленск, а куды належала накіраваць падначаленых яму спецыялістаў і інструктараў, ён не ўяўляў, як і тое, ці належала іх разам з вольнанаймальнымі і практыкантамі таксама накіраваць у Смаленск. З пазнейшай дакументацыі можна зрабіць выснову, толькі 19 жніўня быў выдадзены адмысловы цыркуляр, у адпаведнасці з якім у Калугу належала вывезці ўсіх супрацоўнікаў. На месца прызначэння яны трапілі рознымі шляхамі. Некаторыя знаходзіліся ў Калузе ўжо 22 жніўня. Урадавы аграном 31 жніўня 1915 г. інфармаваў ГУЗіД, што ў Калугу прыбылі 14 чалавек з 21, якім належала эвакуіравацца, а на наступны дзень А. С. Еленеўскі спрабаваў падаць ва ўправу спіс з 17 асобаў, эвакуіраваных у Калугу, для выдачы ім грошай на пераезд. У ім былі пазначаны: *Сямён Паўлавіч Паўлаў, Фёдар Мітрафанавіч Казінец, Мікалай Пятровіч Уласаў, Аляксей Пятровіч Уласаў, Васіль Аўраамавіч Берней, Рыгор Севярынавіч Рудскі, Іван Дзям'янавіч Марчышын, Казімір Антонавіч Лункевіч, Рыгор Антонавіч Лінавіцкі, Васіль Іванавіч Клапцоў, Яфім Дзям'янавіч Ануфрыенка, Іван Максімавіч Барушка, Аляксей Пятровіч Князеў, Фёдар Міхайлавіч Шавель, Васіль Гаўрылавіч Мішчанка, Іосіф Вацлававіч Янкоўскі, Баляслаў Сцяпанавіч Бараноўскі*. Напрыканцы верасня 1915 г. у Калузе апынуліся, па звестках Еленеўскага, 22 супрацоўнікі Дэпартамента.

У Калузе некаторыя супрацоўнікі Дэпартамента апынуліся ў складанай сітуацыі і вымушаныя былі шукаць месца працы. Так, у Дэпартамент земляробства ўжо 5 верасня 1915 г. было накіравана прашэнне малодшага інструктара па малочнай гаспадарцы Гарадзенскай губерні Сямёна Паўлавіча Паўлава, дзе ён адзначаў, што знаходзіцца ў Калузе "*без заняткаў*" і прасіў накіраваць яго на масларобчы завод Малочнагаспадарчага інстытута, або "*лепшыя*"



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

малочныя кааперацывы Валагодскай губерні, а калі не, то ўладкаваць па спецыяльнасці ў Аддзел нарыхтовак.

З Калугі былыя супрацоўнікі Дэпартамента раз'ехаліся хто куды: у Тыфліс, Екацерынбург, Аранбург. Аднак яшчэ 28 верасня 1915 г. няўладкаванымі заставаліся шэсць былых супрацоўнікаў Дэпартамента: інструктар Кірухін, два майстры па паляводстве – Янкоўскі і Лункевіч, тры тэхнікі па садаводстве – Сініцын, Шавель і Вастравумаў.

***Эвакуацыя маёмасці.*** Поўная эвакуацыя рухомых рэчаў, якія належалі Дэпартаменту, ва ўмовах хуткага набліжэння фронту не была магчымай. Так, захаваўся "*Спіс казённай маёмасці, якая засталася не вывезенай з г. Пружаны Гарадзенскай губерні пры эвакуацыі ўстановаў Гродзенскай губерні*", складзены 16 жніўня 1915 г. майстрам па лугаводстве ў Пружанскім павеце В. Клапцовым, паводле якога на акупіраванай тэрыторыі засталіся наступныя прылады: *лугавы плуг "Дзіра", разорнік "Гроса", куп'ярэз "Мантарэйля"*, а таксама насенне і ўгнаенне: *Рэйграса англійскага сем фунтаў ды французскага тры фунты, канюшыны белай тры фунты, два мяхі чылійскай салітры, адзін мех калійнай солі* і іншае – разам 34 пазіцыі.

Ужо па прыбыцці ў Калугу дастаўленая з Гарадзенскай губерні маёмасць была ізноў праінвертарызаваная. Як высветлілася, частку грузаў па дарозе пашкодзілі. Асабліва гэтым пераймаліся мясцовыя ўстановы, якім маёмасць перадавалася на захаванне. Пра характар грузаў, якія належалі дэпартаменту, вядома на падставе некалькіх вопісаў. У першы з іх, складзены 4 верасня 1915 г., увайшлі машыны і прылады, якія трапілі на склад Калужскага губернскага земства. Туды на захаванне перадалі ***ўсходне-прускія машыны***: іх было 182 (у тым ліку – *30 плугоў, 24 плужныя бараны, 9 сартыровак Рэбера*, *чатыры конных граблі, 30 веялак* і інш). Асобна былі вылучаны 16 пазіцый, якія належалі ***Азярніцкаму пракатнаму пункту***: *дзве бараны "Зігзаг", адна барана "Вржасінскага", адна конная абганялка "Планет", сеялка "Планет" і інш*. Акрамя таго, на гэты склад трапілі сельскагаспадарчыя прылады прыватных асобаў у колькасці 43 адзінак, у тым ліку: *веялка "Сака", плуг Дэера, барана Аўраса, барана Лааке, барана Ганкмо* – разам 241 пазіцыя. На той жа склад Калужскага земства 11 верасня 1915 г. былі дастаўлены машыны і прыстасаванні Верцялішскага сельскагаспадарчага таварыства, а таксама Верцялішскага і Азярніцкага крэдытных таварыстваў – агульна 47 пазіцый. Як відаць з гэтых спісаў, дапамога Дэпартамента ажыццяўлялася з шырокім выкарыстаннем замежнай тэхнікі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

На думку гарадзенскага ўрадавага агранома А.С. Еленеўскага, усю маемасць Дэпартамента належала перадаць у поўную ўласнасць Калужскага губернскага земства.

У Калугу таксама былі вывезены асабістыя рэчы супрацоўнікаў Дэпартамента, а таксама бібліятэка і рознае абсталяванне Азярніцкай сельскагаспадарчай школы. У спісе маёмасці школы дадзены пералік кніг па сельскай гаспадарцы, часопісаў, плакатаў, дапаможных прыстасаванняў (мікраскопы, тэлурый, мадэлі кароў, пладоў, чароўны ліхтар, этымалагічная калекцыя, хімічны посуд і прыборы, пчалярскія інструменты), а таксама так званы інвентар, да якога аднеслі, акрамя лямпы, гадзінніка і сякеры, іконы ды партрэты "*Государя и Государыни*". Пазней, у лістападзе 1916 г. інспектар Уласаў правёў рэвізію маёмасці Азярніцкай школы, якая захоўвалася ў Гур'еўскай ніжэйшай сельскагаспадарчай школе, у акце якой адзначалася: *"У выпадку аднаўлення Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школай сваёй дзейнасці ўсе прынятыя рэчы, якія захавалі сваю прыдатнасць па загаду Дэпартамента Земляробства будуць вернутыя назад"*.

Такім чынам, эвакуацыя маёмасці і супрацоўнікаў Дэпартамента земляробства прайшла без асаблівых прыгодаў. Па найбольш поўных звестках, у Калугу прыбыло 22 чалавекі. Маёмасць Дэпартамента, якую ўдалося вывезці, перадалі на захаванне ў мясцовыя ўстановы Калужскай губерніі.

**КРЫНІЦЫ**

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 25.
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 41.

УДК 476.6:657.478(476.6)

## ВЕРОИСПОВЕДНЫЙ СОСТАВ НАСЕЛЕНИЯ МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ (1858-1913 ГГ.)

**Ганчар А.И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

В данной статье предлагается анализ численности вероисповедного состава населения Минской губернии за 1858-1913 гг.

Рост количества жителей, не принадлежавших к православному вероисповеданию, находился в сильной зависимости от численности православных: коэффициент корреляции между численностью православных и старообрядцев составил 0,97%, между численностью право-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ